**УДК 94(476)"X/XVII"**

# ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ ЖЫЛЛЁВА-ГАСПАДАРЧЫХ КОМПЛЕКСАЎ ПОЛАЦКА XI – XVIII стст.

***А.Л. КОЦ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Даследаванне сядзібнай забудовы з'яўляецца перспектыўным накірункам археалагічнага вывучэння старажытнага Полацка. Вынікі вывучэння жылой забудовы Полацка разглядаліся археолагамі ў кантэксце ўласных даследаванняў, таму на сённяшні дзень няма абагульняючай працы аб жылой забудове горада ў перыяд з XI па XVIII ст. Цалкам вывучаныя закрытыя археалагічныя комплексы – жылыя сядзібы – у Полацку адсутнічаюць. Адкрытыя часткі сядзібнай забудовы дазваляюць прапаноўваць розныя па ступені дэталізацыі гістарычныя рэканструкцыі. Тэрмін "жыллёва-гаспадарчы комплекс" канкрэтызуе аб'екты, якія ўваходзяць у склад сядзібы, што дазваляе разглядаць асобныя яе элементы як маркеры прыналежнасці да жылога ці гаспадарчага комплекса.*

***Ключавыя словы:*** *жыллёва-гаспадарчы комплекс, археалагічнае вывучэнне, Полацк, жылыя сядзібы.*

**Уводзіны.** Полацк – горад з унікальнай і непаўторнай гістарычнай спадчынай. Паводле пісьмовых даных Полацк упершыню ўзгадваецца ў 862 г. Матэрыялы археалагічных раскопак Полацка падцвярджаюць існаванне горада з VIII ст., а першыя жыхары на тэрыторыі горада з'явіліся ў жалезным веку. Але першасныя даныя па развіцці жыллёва-гаспадарчых комплексаў паводле археалагічных матэрыялаў прыпадаюць толькі на X – XI стст. [1]

Па пісьмовых звестках XVI – XVIII стст. вядома, што сядзібнай адзінкай у гарадской прасторы Полацка выступае "пляц" [1, с. 549–550, 574]. Таксама можна сустрэць тэрмін "грунт" ("*кгрунъt*"), які вызначае пэўны зямельны надзел [1, с. 594, 604, 605]. Вуліца складалася з падобных надзелаў, якія выступалі тыльным бокам на дарогу і былі выцягнуты ў глыб пляца. Такім чынам жыллёва-гаспадарчы комплекс мы вызначаем як сядзібу з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі і іншымі элементамі, якая ўключана ў гістарычны і храналагічны кантэкст тапаграфіі горада. Вызначаная сядзіба мае храналагічныя межы існавання і абмежаваную тэрыторыю ў гарадской прасторы Полацка. Любыя маркеры сядзібнай забудовы, прыкметы існавання жылых або гаспадарчых пабудоў таксама з'яўляюцца часткамі жыллёва-гаспадарчых комплексаў.

Тэмы развіцця жыллёва-гаспадарчых комплексаў у шырокім храналагічным кантэксце з XI па XVIII ст., а таксама сядзібнай забудовы і іншых аб'ектаў гарадской структуры асобна не разглядаліся. Полацкія даследчыкі (Г.В. Штыхаў, С.В. Тарасаў, Д.У. Дук, А.Р. Мітрафанаў, В.Р. Тарасенка, А.А. Салаўёў і інш.) у сваіх навуковых працах разглядалі развіццё асобных жыллёва-гаспадарчых комплексаў у кантэксце даных уласных археалагічных даследаванняў, альбо ў рэчышчы раскрыцця прадмета даследавання, асобных аспектаў матэрыяльнай культуры Полацка.

**Асноўная частка.** Пры археалагічных раскопках пластоў да XI ст. слядоў сядзібнай забудовы не вылучана. На селішчы-перадграддзі і Рагвалодавым гарадзішчы зафіксаваны толькі развалы печак з жылых будынкаў. На Верхнім замаку выяўлены рэшткі дамоў і гаспадарчых пабудоў XII – XVII стст., якія захаваліся ў мокрым культурным пласце. Яны з'яўляюцца эталонам для характарыстыкі жылой забудовы горада ў азначаны перыяд. Ніжні замак, як і Вялікі пасад, таксама выдатна захоўвае арганіку, і таму тут можна выразна прасачыць прыклады жылой забудовы горада да пачатку XVI ст. або зафіксаваць асобныя элементы жыллёва-гаспадарчых комплексаў. На Запалоцкім пасадзе ў асноўнай масе вылучэнне жылёва-гаспадарчых комплексаў ажыццяўляецца па слядах культурнага пласта (ці мацерыковым ямам) пры фіксацыі рэштак печаў. Левабярэжныя пасады Полацка з'яўляюцца слаба даследаванымі і толькі асобныя жыллёва-гаспадарчыя комплексы XVII ст. зафіксаваны на тэрыторыі Экімані.

Д.У. Дукам шырока выкарыстаны матэрыялы пісьмовых крыніц у вызначэнні памераў пляцаў, размяшчэнні сядзібных комплексаў і трасіроўкі вуліц. Па матэрыялах рэвізіі Полацка 1765 г. ён правёў аналіз памераў гарадскіх надзелаў, іх уласнікаў, накірунку і размяшчэння вуліц на тэрыторыі пасадаў (Вялікага і Крыўцова), Верхняга і Ніжняга замкаў [2]. Да пытання трасіроўкі вуліц таксама звяртаўся С.В. Тарасаў, які рэканструяваў магчымае размяшчэнне вуліц на Верхнім замку ў XII – XIV стст. [7, с. 164]. Горад захоўвае сваю тапаграфію пасадаў і замкаў амаль у нязменным выглядзе з канца XVI – XVII стст. і нават больш ранняга часу, што дае падставы вызначыць статус Полацка як горада-музея.

На пэўнай частцы Запалоцкага пасада, а таксама на Вялікім і Экіманьскім пасадах тапаграфічная структура вуліц і некаторых сядзібных надзелаў з размяшчэннем пабудоў захавалася амаль у нязменным

[1] Вусны даклад па гэтай тэме быў агучаны на IV Міжнародным кангрэсе даследчыкаў Беларусі 2–4 кастрычніка 2015 г. ў г. Коўна (Літва).

выглядзе з XVI – XVIII стст. Супастаўленне старадаўняй і сучаснай гарадской забудовы можа дапамагчы ў вызначэнні межаў старажытных сядзібных пляцаў і жыллёва-гаспадарчых комплексаў. Так, вызначана, што на Экіманькім пасадзе асобныя надзелы зямлі маюць плошчу, якая супадае з плошчай пляцаў XVI – XVIII стст. Магчыма, што межы гэтых пляцаў адпавядаюць дзяленню ўчасткаў у азначаны перыяд. Гэта выключны і ўнікальны выпадак для беларускага горада, дзе захоўваецца структура землепадзелу з XVII – XVIII стст. Выяўленне і даследаванне этнаграфічных сядзібных комплексаў горада таксама з'яўляецца актуальным накірункам вывучэння мінулага Полацка. Так, у шэрагу прыватнай забудовы Экіманьскага, Запалоцкага і Задзвінскіх пасадаў захаваліся асобныя дамы і гаспадарчыя пабудовы другой паловы XIX – пачатку XX стст.

Перспектыўнымі накірункамі далейшага вывучэння з'яўляецца выяўленне шэрагу закрытых археалагічных комплексаў на ўнікальным помніку археалогіі – Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка. Тут, у заходняй частцы, на плошчы каля 30 га захаваўся амаль у некранутым стане культурны слой XI – XII стст. [5; 6]. Ён не пашкоджаны будаўнічай дзейнасцю і больш познімі напластаваннямі XIV –XX стст. Слядоў будынкаў XVI – XIX стст. на дадзенай пляцоўцы не зафіксавана. Фарміраванне культурнага слою і адзіночныя знаходкі фрагментаў пячной кафлі XVI – XIX стст. у заходняй частцы Запалоцкага пасаду могуць быць абумоўлены размяшчэннем фальваркаў. Верагодна, пасля завяршэння тут жыццядзейнасці людзей на мяжы XII – XIII стст. дадзеная тэрыторыя магла выкарыстоўвацца пад агароды або выпас хатняй жывёлы [4, с. 110]. У такіх умовах культурны слой мінімальна пашкоджаны, што дае магчымасць даследаваць рэшткі жыллёва-гаспадарчых комплексаў старажытнарускага перыяду метадам дасканалых археалагічных раскопак. Таксама, метады геаакустычнай ці магнітаразведкі могуць паспрыяць выяўленню і фіксацыі рэштак закрытых комплексаў.

Неад'емнай часткай даследаванняў закрытых археалагічных комплексаў з'яўляецца не толькі іх наяўнае вывучэнне ў часе раскопак, але і падрабязны аналіз рэчавага матэрыялу. І ў першую чаргу гэта масавы матэрыял – кераміка. Індывідуальныя знаходкі ювелірных вырабаў, касцяныя прылады, жалезныя прадметы і інш. не заўсёды могуць даць нам дакладную датыроўку помніка. Дзякуючы вывучэнню керамічнага матэрыялу можна больш дасканала суаднесці яго з сінхроннымі помнікамі, якія размяшчаюцца побач, а ў асобных выпадках – вызначыць храналагічныя межы комплекса. Важкім у вывучэнні масавых знаходак з'яўляецца стварэнне тыпалагічных схем керамічнага посуду для розных частак Полацка.

Працяг археалагічнага вывучэння ўсходняй часткі Верхняга замка, дзе выдатна захаваліся драўляныя канструкцыі XII – XIV стст., можа прывесці да стварэння дэндрашкалы для Полацка. Правядзенне раскопак на дадзенай тэрыторыі павінна суправаджацца не толькі дасканалым вывучэннем драўляных канструкцый, але і іх далейшай кансервацыяй і музеефікацыяй старажытнай драўлянай забудовы. Падобную сітуацыю можна вызначыць і ў заходняй частцы Вялікага пасаду. На дадзеным месцы вільготная мацерыковая гліна спрыяе захаванню дрэва ў культурным слое. Таму тут добра захоўваюцца рэшткі драўляных пабудоў і нават цэлыя сядзібныя комплексы, галоўным чынам, XVI – XVIII стст., у меншай ступені – XI – XIV стст.

Апошнім часам актывізаваліся даследаванні помнікаў старажытнарускай архітэктуры ў Полацку. Гэтая тэма не мае прамога дачынення да вывучэння жыллёва-гаспадарчых комплексаў, але ўскосныя сведчанні даюць магчымасць больш выразна паглядзець на пэўныя тэхнічныя прыёмы ў прымяненні і апрацоўцы дрэва. Так, і пры ўзвядзенні манументальных пабудоў (на прыкладзе Спаса-Праабражэнскага храма), мы можам казаць, што дрэва шырока выкарыстоўвалася для вырабу цяг, якія ўмуроўваліся ў мур і служылі як арматура для сцяны, з дошак рабіліся сталы і формы для вытворчасці плінфы, кроквенная канструкцыя страхі таксама была драўлянай. Апорныя дошкі XII ст. захаваліся ў слупах храма і перакрыццях нішаў і інш. Цікава, што Пятніцкая царква Бельчыцкага манастыра можа мець сваім прататыпам драўляны храм, але параўнанне форм і канструкый патрабуе ўдакладненняў і новых даледаванняў.

Пісьмовыя крыніцы захоўваюць вялікі пласт інфармацыі па жылой забудове горада перыяду XVI – XVIII стст. Улічваючы колькасць захаваўшыхся пісьмовых дакументаў па азначанай тэматыцы (галоўным чынам магістрацкіх і актавых кніг), то аналіз пісьмовай крыніцазнаўчай базы павінен істотна дапаўняць археалагічныя даследаванні жыллёва-гаспадарчых комплексаў Полацка.

На сучасным этапе развіцця археалагічнай навукі актуальнымі з'яўляюцца новыя метады, якія прапануюць даследчыкі дакладных навук. Так пры вывучэнні жыллёва-гаспадарчых комплексаў актыўна выкарыстоўваецца метад дэндрахраналогіі і радыёвуглярoднга анаізу, актуальным з'яўляецца ізатопны аналіз.

Даследаванні жылой прсторы неад'емна звязана з працэсам жыццядзейнасці чалавека. У гэтым рэчышчы важнымі з'яўляюццю дадзеныя антрапалогіі.

Пры вывучэні жылой забудовы актуальным з'яўляецца правядзенне экперыментаў па будаўніцтве драўляных зрубаў, спроб аднаўлення старажытных печаў і мэблі, працэсу выкарыстання драўляных пабудоў і інш. Дадзеная тэма дасць магчымасць больш грунтоўна вызначыць асобныя дэталі будаўніцтва і паў-

сядзённага жыцця чалавека. Падобныя эксперыментальныя даследаванні варта было б наладзіць і пры вывучэнні сярэднявечнай забудовы Полацка. Галоўнай мэтай можа стаць музей пад адкрытым небам з экспанаваннем рэштак драўлянай забудовы з археалагічных помнікаў горада. Але працэс стварэння падобнага музея патрабуе вялікіх намаганняў калектыву аўтараў і спонсараў. Пакуль дадзеная ідэя на знайшла дастковай колькасці станоўчых водгукаў у культурнай прасторы горада.

Пачынаючы з 2000 г. у Полацку штогадова дзейнічае археалагічная экспедыцыя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Асноўным кіраўніком экспедыцыі да 2017 г. з'яўляўся доктар гістарычных навук Д.У. Дук, з 2012 г. да даследаванняў далучаецца аўтар даклада. Актыўную даследчую працу праводзяць выкладчыкі Полацкага ўніверсітэта І.У. Магалінскі і В.У. Чараўко і навуковы супрацоўнік Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка А.А. Салаўёў. Як правіла ў раскопках актыўна ўдзельнічаюць студэнты-практыканты і мясцовыя школьнікі. Д.У. Дукам даследаваны розныя часткі горада, што дазволіла вучонаму прасачыць тапаграфічную структуру горада на розных стадыях развіцця пасадаў і выявіць шэраг закрытых жыллёва-гаспадарчых комплексаў. Але пытанне ў вызначэнні плошчы горада на розных стадыях існавання і яго тапаграфіі далёка да канчатковага вырашэння. У апошнія гады атрымалася вызначыць плошчу Запалоцкага пасада на перыяд XI – XII стст. у межах 30 га, прыблізна вызначыць паўночную мяжу паселішчаў за ракой Палатой. Агульнае развіццё тапаграфіі горада дае магчымасць меркаваць аб пэўных пляцоўках, на якіх размяшчалася жылая забудова гараджан.

У Полацку на абсалютнай большаці помнікаў археалогіі адсутнічае так званы вільготны слой. Таму захаванне арганічных рэчываў і драўляных канструкцый вельмі фрагментаванае ў раскопах, што ўскладняе іх археалагічнае вывучэнне. Выключэннем з'яўляюцца Вялікі пасад і ўсходняя частка Верхняга замка. Апошняя з'уляецца найбольш перспектыўным месцам у даследаванні жыллёва-гаспадарчых комплексаў XII – XIV стст., але раскопкі тут ўскладнены магутным культурным пластом (да 5 м на асобных участках). У апошнія гады было вызначана, што на Экіманьскім пасадзе таксама сустракаецца мокры культурны пласт у перадмацерыковым пласце і мацерыковых ямах. Гэта абумоўлена высокім узроўнем грунтовых вод. На Экіманьскім пасадзе зафіксавана захаванне драўніны і зерня ў мацерыковай яме на глыбіні да 1,5 м, якая засталася ад падклета жылога дома XVII ст. Падчас археалагічнага нагляду А.А. Салаўёвым вуліцы Набережнай быў зафіксаваны насціл маставой з бярвення [8, с. 31; 3, с. 132]. Магчыма, што падобная сітуацыя з захаваннем матэрыялаў з арганічных злучэнняў можа назірацца і на іншых левабярэжных пасадах Полацка, што з'уляецца вельмі актуальным для археалагічных даследаванняў пры вывучэнні жыллёва-гаспадарчых комплексаў.

Шэраг помнікаў археалогіі, гістарычных частак старажытнага Полацка, шчыльна забудаваны або заняты аб'ектамі сацыяльна-культурнага прызначэння. Усё гэта таксама ўскладняе правядзенне археалагічных даследаванняў і назіранне за захаваннем культурнага пласта. Прыдатным полем археалагічнай дзейнасці з'яўляюцца толькі некаторыя невялікія надзелы зямлі пры адміністрацыйных будынках, незабудаваныя часткі горада, якія значна параслі кустоўем або лесам, а таксама заходняя частка Запалоцкага пасада. Яшчэ можна казаць аб некатрых выпадках даследаванняў пляцовак перад будаўніцтвам або рэканструкцыяй новых адміністрацыйных будынкаў у цэнтры горада.

Гаспадарчая дзейнасць у Полацку за апошнія гады вельмі моцна актывізавалася. Будаўніцтва жылога фонду ў межах ахоўваемых зон не заўсёды прадугледжвае паўнавартасныя археалагічныя даследаванні. Як правіла праводзяцца археалагічныя назіранні ў траншэях за пракладаннем камунікацый, але гэта дае мінімальную інфармацыю аб культурным пласце і мінімальную калекцыю знаходак з месца даследаванняў помніка археалогіі ў параўнанні з паўнавартаснымі археалагічнымі раскопкамі. Нажаль, не дасведчанасць большасці ўласнікаў прыватных надзелаў аб знаходжанні сядзібы ў ахоўваемай зоне ці зоне будаўнічага рэгулявання, прыводзіць да гаспадарчага разбурэння культурных напластаванняў. У іншых выпадках несумленнасць гаспадароў, якія маюць на мэце правядзенне земляных прац перад бедаўніцтвам, прыводзіць да новых пашкоджанняў помнікаў археалогіі.

Некаторыя гістарычныя часткі Полацка не ўваходзяць у ахоўную зону або зону рэгулявання будоўлі, таму рэгламентаваць земляныя працы ў Экімані, на Задзвінскіх пасадах фактычна не магчыма.

**Заключэнне.** Такім чынам, падсумоўваючы, можна вызначыць, што найбольш перспектыўным напрамкам археалагічнага вывучэння жыллёва-гаспадарчых комплексаў з'яўляюцца помнікі з наяўным "мокрым" культурным пластом (Верхні замак, Вялікі пасад і левабярэжная частка горада). Удасканаленне падыходаў да вывучэння археалагічных косплексаў дазволіць выявіць больш дакладных момантаў у гаспадарчай дзейнасці і побытавым жыцці старажытных палачан. Сукупнасць атрыманых на сённяшні дзень даных дазваляе выявіць т.зв. рэперныя кропкі для захавання, вывучэння, музеефікацыі і кансервацыі рэштаў жыллёва-гаспадарчых комплексаў і драўлянай забудовы XI – XVIII стст.

Да асноўных праблем можна аднесці нізкі ўзровень аховы помнікаў археалогіі ў горадзе, значная шчыльнасць забудовы некаторых частках старажытнага горада прыватнымі надзеламі з жыламі і гаспадарчымі пабудовамі, што перашкаджае правядзенню даследаванняў.

Тэма вывучэння жыёва-гаспадарчых комплексаў вельмі цесна звязана з даследаваннямі ў галіне паўсядзённага побыту гарадскога насельніцтва і выклікае вялікую зацікаўленасць айчынных і замежных гісторыкаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Акты книги полоцкого магистрата за 1656-1657 гг. / сост. М.Ю. Гордеев // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX – XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV – XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О.Н. Левко [и др.] ; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О.Н. Левко ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2012. – С. 545–702.
2. Дук, Д.В. Городское пространство и социальная топография Полоцка по данным ревизии 1765 года / Д.В. Дук // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2015. – № 9. – С. 2–13.
3. Дук, Д.В. Стратиграфия и хронология объектов Полоцка XI – XVIII вв.: исследования 1928 – 2011 гг. // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX-XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV-XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О.Н. Левко [и др.] ; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О.Н. Левко ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2012. – С. 113–133.
4. Дук, Д.У. Унікальны помнік археалогіі – заходняя частка Запалоцкага пасада Полацка: праблемы аховы і вывучэння // Гісторыя і археалогі Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы VI Міжнар. канф., Полацк, 1–3 ліст. 2012 г. : у 2 ч. / Полац. дзярж. ун-т, Нац. Полац. гіс.-куль. музей-запаведнік. – Полацк : НПГКМЗ, 2013. – Ч. 1. – С. 108–119.
5. Коц, А.Л. Да пытання аб забудове Полацкага Запалоцкага пасада ў XI–XII стст. (па матэрыялах археалагічных раскопак 2012–2013 і 2015–2016 гг.). / А.Л. Коц // Віцебскі край : матэрыялы II Міжнар. навук.-практ. канф, Віцебск, 24 ліст. 2016 г. ; рэдкал.: Т.А. Адамян [і інш.]. – Мінск : Нац. бібл. Беларусі, 2017. – Т. 2. – С. 59–66, 309–311.
6. Коц, А.Л. Ювелірная майстэрня XII ст. на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка (па матэрыялах археалагічных раскопак 2013 г.) / А.Л. Коц // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитаные науки. – 2015. – № 1. – С. 18–27.
7. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С. В. Тарасаў. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 183 с.
8. Соловьёв, А.А. К вопросу о реконструкции исторической топографии Экимани / А.А. Соловьёв // Вест. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2013. – № 9. – С. 29–39.

*Пастуніў 21.10.2020*

## THE PROBLEMS AND THE PROSPECTS OF STUDYING POLOTSK ESTATE COMPLEXES IN XI – XVIII CENTURIES

***A. KOTS***

*The study of manor buildings is a promising area of archaeological study in the ancient Polotsk. The results study of residential development in Polotsk were considered by archaeologists in the context of their own research. There is no general work on the residential development of the city in the XI – XVIII centuries today. Entirely studied closed archaeological complexes in Polotsk are absent. The excavated parts of the manor buildings allow archaeologists to compare and compile different historical reconstructions. The term " estate complexes " specifies the objects that are part of the estate, which allows us to consider individual elements as markers belonging to a residential or household complex.*

***Keywords:*** *housing and utility complex, archaeological study, Polotsk, residential estate.*